


Назва прэзентацыі:

**Зямля, дзе  пашчасціла нарадзіцца!**

Аўтар:

**Наумік Анастасія Аляксандраўна**, 14 гадоў.

ДУА «Люсінскі дзіцячы сад – сярэдняя школа імя Якуба Коласа», 8 клас

Кіраўнік:

**Стрыжыч Ала Канстанцінаўна,**

настаўнік геаграфіі,

ДУА «Люсінскі дзіцячы сад – сярэдняя школа імя Якуба Коласа»,

Мабільны тэлефон: 8029 824 86 81













# Зямля, дзе пашчасціла нарадзіцца !













I ♥ Belarus

# *Гэта - маё Люсіна!!!*

Вы не ведаеце,  дзе гэта?
Дык я з задавальненнем раскажу!
Аб сваім родным краі,
яго зямлі і людзях харошых.







*Гэта  маё Люсіна,*
*якім моцна ганаруся я…*
*Гэта вёсачка  ў*
*роднай Беларусі!*
*На карце*
*не цяжка*
*знайсці.*

***Адправімся***
***на пошукі  разам!***
***У маім праекце “Тры да аднаго”***





# …еларусь! *Родная мая краіна.*

***…ая ў свеце сваімі дасягненнямі, прыродай і людзьмі.***
***…столькі адметнасцяў, што ўсяго і не пералічыць,***
***не ўспомніць. Але давайце спынімся на некаторых з іх.***

## Беларусь – цэнтр Еўропы.




У шэрага краін ёсць месцы, якія
прэтэндуюць таксама так называцца.
Ёсць нават такая карта.
А што ж да нашай краіны?
На карце пазначана Цэнтрам Еўропы возера
**Шо** Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці.
У цяперашні час разлікі сведчаць,
што Цэнтр Еўропы знаходзіцца
ў той жа вобласці, але ў горадзе **Полацку**,
І мае каардынаты - 55°30′ пн. ш. 28°48′ у. д.
Памятны знак, які сведчыць пра гэта,
мае надпісы на пяці мовах свету.







# Самыя старажытныя лясы Еўропы

размешчаны на тэрыторыі нашай краіны. Беларуская Амазонія на Прыпяцкім Палессі – агульнапрызнаныя «лёгкія Еўропы».

Нацыянальны парк «**Прыпяцкі**»–
е месца ў свеце,
каваліся некранутымі
ражытнейшыя
ыя дубровы.

## Блакітная крыніца -

у Магілёўскай вобласці, у 8 км на паўднёвы усход ад г.Слаўгарада. Самая вялікая крыніца на тэрыторыі ўсёй Усходне-Еўрапейскай раўніны, помнік прыроды рэспубліканскага значэння.



Кожную секунду каля 60 літраў найчыстай вады выштурхваецца на паверхню з глыбіні 200-300 м. Кажуць, быццам у крыніцы і зусім няма дна. Колькасць карысных элементаў тут уражае. У складзе вады адзначаецца падвышанае утрыманне фтору і крэмнію. Здаўна славіцца гаючымі якасцямі і прыцягвае турыстаў.

# *Дасягненні краіны:*

У Беларусі вырабляецца самы вялікі самазвал у свеце.
**БелАЗ-75710** важыць 360 т., вышыня яго колаў 4 метры, агульная вышыня – 10 метраў – як 3-х этажны дом, даўжыня - большая за вагон таварнага поезда.
Прымяняецца ў горназдабычы і будаўніцтве
і каштуе прыкладна $10 млн.!






Нашы праграмісты заснавалі
Кампанію **Wargaming,**
якая стварыла папулярную гульню
**World of Tanks**
і мае зараз 6000 супрацоўнікаў
і 120 мільёнаў карыстальнікаў у свеце.

А таксама распрацавалі дадатак **Viber,**
які з'яўляецца трэцім у свеце па папулярнасці
месэнджарам пасля Facebook Messenger, і WhatsApp,
якое было куплена японскім гігантам
Электроннага гандлю Rakuten за 900 тыс. даляраў.



# Славутыя выхадцы з Беларусі, яе дзеці, што робяць вядомай сваю матухну – краіну:

## Жарэс Алфёраў



Лаўрэат Нобелеўскай прэміі па фізіцы 2000 года. Ён вынаходнік гетэратранзістора , стваральнік паўправаднікоў і лазераў, што выкарыстоўваюцца практычна ў кожным сучасным кампутары. Нарадзіўся ў Віцебску.

## Луіс Барт Маер



Вядомы амерыканскі кінапрадзюсар, сапраўднае імя – Лазар Меір. Месца яго народзінаў - беларуская сталіца. Стварыў цэлую ідустрыю забавак у ЗША. Заснавальнік галівудскай кінастудыі Metro-Goldwyn-Mayer.

## Мікалай Судзілоўскі (Нікалас Русель)



Этнограф, географ, хімік, біёлаг, лекар-генетык, рэвалюцыянер-народнік, першы прэзідэнт сената Гавайскіх астравоў. Нарадзіўся ў 1850 г. у Магілёве ў збяднелай дваранскай сям'і. З 1892 года жыў на Гаваях, дзе абараняў правы карэнных жыхароў.

# Вобласць мая – Брэсцкая!



## *Чым жа яна ўнікальная?*

- Тут знаходзіцца нацыянальны парк **Белавежская пушча** - самы вялікі і стары лес у Еўропе, уключаны ЮНЕСКА у спіс Сусветнай спадчыны. І жыве самая вялікая жывёла Еўропы - зубр.
- Самым старым (па ацэнках спецыялістаў – яму прыкладна 850 гадоў) лічыцца **Цар-дуб**, што расце ў **Пажэжынскі**м Лясніцтве Маларыцкага лясгаса, недалёка ад вёскі Старое Раматава, у 35 км ад Брэста па трасе Р17 Брэст — Макраны . Яго вышыня — 46 м, а дыяметр — больш за 2 м.
- У старых фартах Брэсцкай крэпасці знаходзіцца най-Буйнейшая ў Беларусі і ў Еўропе зімоўля **кажаноў.** Створаны **заказнік «Барбастэла»** - першы ў Беларусі спецыялізаваны заказнік па захаванні рэдкіх кажаноў на зімоўлі. Тут жа расце самая вялікая ў Беларусі папуляцыя самай маленькай ў свеце расліны – вольфіі.












# *Славутасці воблас***ці**

Археалагічны музей **«Бярэсце»**, што на Шпітальным востраве Брэсцкай крэпасці, да гэтага часу застаецца адзіным у Еўропе музеем сярэдневяковага ўсходнеславянскага горада, унікальным помнікам драўлянага дойлідства 13 стагоддзя,
які ўключае 30 пабудоў і 2 вуліцы.





**Музейны комплекс Напалеона Орды**
(Іванаўскі раён в. Варацэвічы) – вядомага ў Еўропе мастака, кампазітара, педагога, публіцыста музыканта, піяніста, скульптара, публіцыста і педагога 19 стагоддзя.



**Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А.В.Суворава**
– вялікага рускага палкаводца. Адзіны ў рэспубліцы.
Тут размяшчалася яго рэзідэнцыя, на жаль, не захавалася,
Затое выдатна захаваўся раскошны жывапісны парк
на кобрынскіх землях, што былі падараваны герою
за заслугі імператрыцай Кацярынай Другой.

# *Найбольш вядомыя выхадцы з Берасцейскай зямлі:*



**Хаім Вейцман** — першы прэзідэнт Ізраіля родам з аграмястэчка Моталь. Хайм Азрыэль Вейцман, вядомы палітык, навуковец-хімік, які на працягу ўсяго жыцця славіўся зацятым абаронцам габрэяў па ўсім свеце. Нарадзіўся ў 1874 годзе ў Гарадзенскай губерні Расійскай Імперыі, Недалёка ад Пінска. Цяпер гэта тэрыторыя Іванаўскага раёна.



**Тадэвуш Касцюшка** - дзяржаўнага дзеяч і вайскавод . Узяў удзел у вайне за незалежнасць ЗША ў званні палкоўніка. Адрозніўся тым, што не дзейнічаў па прынятых стандартах. Мерачоўшчына, невялікі фальварак, у 1,5 км на захад ад Косава Івацэвіцкага раёна – Радзіма нацыянальнага героя Беларусі, Польшчы, ЗША, ганаровага грамадзяніна Францыі.



**Пётр Клімук –** адважны савецкі касманаўт і ваенны лётчык. Удзельнік трох экспедыцый, вучоны ў вобласці тэхнічных навук, двойчы Герой Савецкага Саюза.Нарадзіўся ў в.Камароўка Брэсцкага раёна ў 1942 г.

# Ганцавіцкі раён–

## *адзін з 16 раёнаў вобласці.*



Карта «рыбка» Ганцавіцкага раёна

- Тут знаходзіцца **«Выганашчанскае»** —гідралагічны заказнік рэспубліканскага значэння з часткай канала Агінскага. Створаны з мэтай захавання аднаго з буйнейшых леса-балотных масіваў Еўропы Агінскага. Створаны з мэтай захавання аднаго з буйнейшых леса-балотных масіваў Еўропы на галоўным еўрапейскім водападзелеводападзеле рэк Балтыйскагаводападзеле рэк Балтыйскага і Чорнагаводападзеле рэк Балтыйскага і Чорнага мораў басейнаўвода Балтыйскага і Чорнага мораў басейнаў рэк Балтыйскага і Чорнага мораў басейнаў рэк Шчараводападзеле рэк Балтыйскага і Чорнага мораў басейнаў рэк








- Ганцавіцкая эксперыментальная **база ЦБС «Журавінка»** - першая ў Беларусі прамысловая плантацыя журавіны буйнаплоднай. Цяпер тут праводзяцца інтрадукцыйныя даследаванні і гатунковыя выпрабаванні ягадных раслін сямейства брусічных.
- У нашым раёне ёсць Святое месца – **Ізбійскі Бор.** Урочышча знаходзіцца на 20-м кіламетры аўтадарогі Ганцавічы – Будча. У сярэдзіне 18 стагоддзя наадным з дрэў з'явілася ікона Божай Маці, якая нібыта і сама сыходзіла сюды. Тут бруілі крыніцы, што валодалі гаючай, ачышчальнай сілай, таму і стала яно месцам паломніцтва.

# *Адметнасці Ганцавіцкай зямлі –*

- Адзіны ў краіне **Музей рыбы** знаходзіцца на берагах вадасховішча Лактышы. На сценах музея развешаны сеткі , якім гадоў па сто, сплеценыя мясцовымі ўмельцамі з саматканых нітак з дапамогай «іглiцы». Усяго ў Беларусі водзіцца 58 розных відаў рыб, 30 з якіх жывуць у вадаёмах Ганцаўшчыны і прадстаўлены ў мясцовым музеі.






Мінеральная вада «**Царыца-1**» і «**Царыца-2**», салодкія газіраваныя напоі вырабляюцца на аснове мясцовай вады, што здабываецца з артэзіянскіх свідравін. У падземных крыніцах, размешчаных на тэрыторыі прадпрыемства ля в.Любашава, вада з падвышаным утрыманнем фтору. Назва радпрыемства «ВоМиЦа» лёгка расшыфроўваецца як «Вада мінеральная «Царыца».

**Агарэвіцкая дзіцяча-юнацкая спартыўная школа** - адна з нямногіх у вобласці, дзе з дзецьмі прафесійна займаюцца конным спортам. Нягледзячы на шматлікія цяжкасці (утрыманне коней, а тым больш завадовых, патрабуе немалых фінансавых выдаткаў), кіраўніцтву мясцовай гаспадаркі атрымалася захаваць спартыўную базу. Тут займаюцца з коньмі і навучаюць дзяцей мастацтву вярховай язды і другім відам спорту сапраўдныя фанаты гэтай справы.



# Выхадцы з Ганцаўшчыны, вядомыя далёка за межамі раёна:




**Аляксандра Герасіменя** - Самая вядомая беларуская плаўчыха, якая заваявала медалі Алімпійскіх гульняў і чэмпіянатаў свету. Актыўна ўдзельнічае ў дабрачыннасці. Само плаванне называе не хобі, і нават не спортам, а жыццём. Нарадзілася ў Мінску, а яе бацька, Віктар Герасіменя, родам з в.Будча.
Ён першы ганцавіцкі спартсмен, які атрымаў званне майстра спорту міжнароднага класа.



**Вадзім Тышкевіч** - родам з Ганцавічаў. Ён стаў адным з лепшых мэраў у Польшчы і зрабіў з горада казку. Вадзім з сястрой і мамай у 1967 . выехаў у польскі горад Новая Суль, дзе ўжо жыла частка сям'і. Мама Вадзіма была родам з Красынічаў.



**Сержпутоўскі Аляксандр Казіміравіч** унёс значны ўклад у беларускую фалькларыстыку, этнаграфію і мовазнаўства, быў правадзейным членам Інбелькульта.Нарадзіўся ў в.Бялевічы Слуцкага павета Мінскай губерні. Калі хлопчыку ледзь споўнілася сем месяцаў, яго бацькі пераехалі на хутар паблізу в. Пярэвалакі. Івырас ён на берагах Лані. Цяпер тое месца, дзе быў колішні хутар, называецца Шарпутоўшчына (Сержпутоўшчына).

# І, нарэшце, - маё Люсіна!!!

**Адзін з 23,5 тысяч у рэспубліцы, з 2178 у вобласці**
**І з 36 сельскіх населеных пунктаў у раёне.**








Я жыву ў вёсцы Люсіна,
Гэтым моцна ганаруся я!
Аб’яўляю зычным голасам:
Знаёмы я з Якубам Коласам!
Шлях яго праз нас прайшоў,
Я яго пазнаў, знайшоў,
І праз творы, што пісаў,
Ён мне многа расказаў.
Пра Кастуся і пра Антося,
Як на “ростанях” жылося,
Хмарка як плыла ў небе,
Як на рэчку хлопцу трэба,
На чым граў Сымон на ўзгорку…
Час не згасіць Якуба зорку!
Яго Цельшына жыве,
Шчасце - долю нам дае.
Тут заўжды мне сонца свеціць,
Вёску родненькую песціць,
Сцежкай Коласа прайшоў –
Бы кветку - папараць знайшоў.
Мне другіх краёў не трэба,
Найяснейшае тут неба!
З чужыны сюды вярнуся,
Бо я – часцінка Беларусі!

*Верш, напісаны маёй сястрой Кацюшай.*





# Мясцовыя ландшафты

*Альбо*
***Гісторыя краю ў тапонімах***



**Валы** – на конт гэтай назвы існуе некалькі тлумачэнняў. Адны кажуць, што назва злучана са словам «голы» - непакрыты лесам, іншыя – што з татарскім паняццям «ол». Яшчэ існуе легенда, што недалёка ад вёскі Люсіна было вялікае балота. Мясцовыя жыхары паблізу пасвілі жывёлу. А замест коней яны трымалі валоў, якімі апрацоўвалісвае землі, вазілі дровы, сена. Неяк у балоце патануў вялікі вол, таму і назвалі ўрочышча Валы.



**Таболка** – у раёне вуліцы Савецкай, па водле старога ландшафтнага тэрміна, гэта «сухое месца».

# Мясцовыя ландшафты:

**Яшукова гара –** ад імя Яшук. На сёт гэтай назвы захаваліся дзве легенды.
***Першая*** расказвае, што на гэтай гарыбыў бой паміж шведамі і князем Яшуком, і што Яшук быў за біты і пахаваны там, сама гара атрымала таму такую назву.
***Другая*** легенда больш дэталёвая, сучасная, закранае эпоху прыгоннага права. Недзе за 10 км. ад Люсіна быў багаты «двор», абшарніцкая сядзіба, куды люсинцы хадзілі адбываць паншчыну. Рэштак гэтага двара не захавалася. На гэту пасаду прыязджаў нейкі бязродны пан Яшук. Ён быў вялікай распустник, чапляўся дадзяўчын і маладых кабет. Гэта выклікала вялікую незадаволенасць сярод хлопцаў і многіх маладых мужчынаў. Яшук быў вялікі жартаўнік, гулец, паляўнічы. Ён спакусіў адну красуню – сялянку, на якой хацеў жаніцца панскі лакей, потым кінуў яе з дзіцём на руках. Тая з гора кінулася ў раку і патанула. Неяк было паляванне. На панаЯшука выскачыў дзік, пан стрэліў у яго, але не трапіў. А кабан бег павольна, як знарок, абіраючы прагаліны. Панкінуўся конна на кані даганяць яго. Раптам кабан знік, як праз зямлю праваліўся. Тым часам насоўвалася ноч. Панадбіўся ад людзей, не ведаючы, куды ісці. Ён спрабаваў крычаць і званіць, але ніхто не адклікаўся. Раптам пануздалася песня.Спявала дзяўчына, счараваная пані, і яна так зачаравала пана, што ён прывязаў каня і пайшоў на голас дзяўчыны-панны. Што ён там убачыў, як правёў ноч, ніхто не ведае. Але калі сталі яго шукаць,то знайшліпавешаным на дрэве. Труп яго знялі і закапалі ў зямлі. Нікому не вядома, як пан апынуўся на дрэве. Пасляпахаванняў Яшука ўначы ўстала вялікая бура. Гэта сведчанне таго, што нехта памёр не сваёй смерцю. І зараз ународзе кажуць, калі на двары бура, то, пэўна што, нехта павесіўся.



# *Асобныя цікавыя аб’екты*:

Так многа родных мясцін, з якімі звязаны ўспаміны –
майго дзяцінства, вясёлых гульняў, шчаслівых момантаў!
І ўсе яны блізкія сэрцу, мілыя краявіды!



**Дуб на поўначы вёскі.**
**Абхват –**
**280 сантыметраў.**

*(левы фотаздымак)*



**Дуб на вуліцы**
**Савецкай, яго**
**дыяметр**
**2 метры,**
**31 сантыметр.**

*(правы фотаздымак)*

Тэхнагенныя
формы рэльефу -



**Кар’ер на ўсходзе вёскі.**
**Вышыня**
**5 – 6 метраў.**

# *Архітэктурныя іскрынкі*:

Магазін “На ростанях”
і аблюбаванае месца адпачынку
землякоў – кафэ “Азёрнае”






Мая родная школа.
Разам з дзіцячым садком.



Мястэчка для душы.
Малітоўны дом пратэстанцкай абшчыны.

# Зямля і людзі:

*Згодна народнай мудрасці - не месца красіць чалавека, а чалавек месца.*

*Таму самы час расказаць пра сваіх слынных землякоў.*

*Тых, што пакінулі след у гісторыі вёскі і нават краіны ў цэлым, у той ці іншы час яе гісторыі….*

Гістарычная асоба – вядомы паэт
яго нашчадкі ў гасцях на нашай зямлі. **Якуб Колас…**

Міхась Канстанцінавіч Міцкевіч
ля памятнага знака на месцы школы,
ой у 1902-1904 гг.
працаваў яго бацька -
куб Колас,
аўтар трылогіі
“На ростанях”,
дзякуючы якому у нас і замацавалася
назва “Цельшына”





Наш сучаснік – Рылка Віталь Аляксандравіч, кандыдат сельгаснавук,загадчык кафедры, выкладчык Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках і яго сястра, загадчыца музея імя Якуба Коласа ў мясцовай школе – настаўніца беларускай мовы – Антыкала Наталля Аляксандраўна.








Пакаленне “нэкст” – маленькая зорачка беларускага спорту Улад Гаўдзіс і яго трэнер , настаўнік фізічнай культуры Жалезны Уладзімір Аляксандравіч.

У Раўбічах прайшлі спаборніцтвы па біятлоне «Снежны снайпер». Ва ўзроставай групе сярэдняга веку сярод хлопчыкаў першае месца заняў Уладзіслаў , які прабег дыстанцыю за 11 хвілін 2 секунды.



- Так многа людзей дастойных, харошых, якія нарадзіліся, жылі і працавалі на нашай,  беларускай, берасцейскай, Люсінскай зямлі….
- *У рамках  свайго маленькага праекта я расказала пра некаторых з іх. Няхай іх  жыццёвы прыклад будзе для многіх пуцяводнай зоркай.*
- А закончыць свой нарыс хачу вершам яшчэ аднаго земляка.





На Палессі ёсць вёска адна,
Тут жывуць працавітыя людзі.
вёску Люсінам клічуць здаўна,
Яе сонейка промнямі будзіць
У дзяўчат нашых кожнае голас
Гучыць скрыпкай дзівоснай у хоры.
Тут настаўнічаў сам Якуб Колас
І пісаў свае раннія творы.
Ён любіў нашу рэчку і поле,
Лес, грыбамі заўсёды багаты.
Бачыў ён і нялёгкую долю,
Што сустрэў каля кожнае хаты.
Вакол возера часта хадзіў,
Пра Ядвісю каханую марыў.
Ён на памяць дубок пасадзіў,
Услаўляючы любан тварык.
Многа вёсак ёсць розных усюды,
Але Люсіна сэрцу мілей.
Мне здаецца, што дзе б я не буду,
Не знайсці мне староніі радней.

*Сяргей Локтыш*

# Дякуй за ўвагу.

